# Рэферат

Аб'ём: 110 с., 57 мал., 14 табл., 29 формул, 33 крыніцы.

СІНТЭЗ МАЎЛЕННЯ, ІНТАНАЦЫЯ, ФАРМАНТЫ, ПРАСОДЫЯ, ВАКОДЭР, АКУСТЫЧНЫЯ ПАРАМЕТРЫ, СПЕКТРАГРАМА, ІНТАНАГРАМА, САНАГРАМА, АСЦЫЛАГРАМА.

У дыпломным праекце прадстаўлена распрацоўка сістэмы сінтэзу маўленчых акустычных сігналаў з улікам інтанацыі выказвання.

*Аб'ект даследавання* – працэсы фарміравання інтанацыйнага контуру і сінтэзу маўленчага сігналу.

*Прадметам даследавання* з'яўляюцца метады і алгарытмы лічбавага сінтэзу гаворкі з кіраваннем прасадычнымі характарыстыкамі (частата асноўнага тону, інтэнсіўнасць, працягласць, паўзы).

*Мэта работы* – распрацоўка праграмна-апаратнага комплексу для сінтэзу натуральнай гаворкі з магчымасцю дынамічнага кіравання інтанацыйным малюнкам выказвання.

Падчас распрацоўкі было праведзена даследаванне акустычных аспектаў артыкуляцыі мовы, фармантнай структуры гукаў і іерархіі сегментных адзінак. Выкананы аналіз існуючых сістэм абазначэння інтанацыйных малюнкаў, прапанаваны і абгрунтаваны метад інтанацыйных табулатур для лічбавага кадавання прасадычных параметраў.

*Атрыманыя вынікі.* Створана праграмная рэалізацыя сістэмы, якая забяспечвае генерацыю гаворкі з натуральнай інтанацыяй. Рэалізавана кіраванне чатырма асноўнымі прасадычнымі параметрамі: частатой асноўнага тону (F0), інтэнсіўнасцю, працягласцю фанэм і паўзамі.

*Сфера ўжывання.* Распрацаваная сістэма можа быць выкарыстана ў сістэмах галасавога інфармавання, аўтаматычных тэлефонных даведніках, сродках агучвання тэкставай інфармацыі для людзей з парушэннямі зроку, а

таксама ў якасці навучальнага стэнда па акустыцы гаворкі і лічбавай апрацоўцы сігналаў.